# “Адчуванне сучаснасці — незвычайнае”



У.Рынкевіч. “Спадчына. Еўфрасіннеўскі манастыр”.

**Вядомы майстар акварэлі, прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Уладзімір Рынкевіч паказаў маладзечанскім гледачам выстаўку сваіх акварэльных карцін “Краіна замкаў і буслоў”. Не пашкадаваў свайго часу мастак і на тое, каб правесці майстар-клас для ахвотных глыбей пазнаёміцца з таямніцамі творчасці.**

Нястомны вандроўнік па роднай Беларусі, ён чарговы раз пажадаў і змог давесці цікавасць да нашай спадчыны. Глыбокая па сэнсе, крыху трывожная па настрої серыя акварэлей прымушае наведвальніка выстаўкі быць удумлівым, назіральным, неабыякавым да сучаснасці і будучыні. У творах сімваламі Беларусі, якую ў XIX стагоддзі лічылі краем палацаў, паўстаюць рэшткі некалі велічных збудаванняў, дзе не проста жылі прадстаўнікі старажытных родаў: многія замкі былі месцамі нараджэння і захоўвання твораў мастацтва.

Майстрам фантазій, алегорый і імправізацыі, які ўжо два дзесяцігоддзі працуе на ніве нацыянальнага духоўнага адраджэння, лічаць крытыкі Уладзіміра Рынкевіча. Вядомы жывапісец Васіль Касцючэнка зазначыў на адкрыцці выстаўкі: “У сучасным мастацтве Уладзімір плыве, як рыба ў вадзе. Адчуванне сучаснасці — незвычайнае. Як мастацтвазнаўца шмат піша аб мастацтве. Не спыняецца ў творчых знаходках, уздымаючыся па прыступках усё вышэй і вышэй, як педагог”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



У.Рынкевіч. “Краіна замкаў і буслоў”.

А Мікола Аўчыннікаў, таксама выдатны акварэліст і педагог гімназіі-каледжа мастацтваў, падкрэсліў: “Я заняткі пачынаю з таго, што адпраўляю сваіх студэнтаў у бібліятэку па знакамітую кнігу Уладзіміра Рынкевіча “Акварэль”. Сачу за ягонай творчасцю, радуюся як за мастака. Яшчэ таму, што шмат увагі ён надае “Беларускай хатцы” ва універсітэце, захаванню рамёстваў нашых бацькоў і дзядоў”.

Экспазіцыя твораў У.Рынкевіча атрымалася выдатнай. Да кожнай работы хацелася вярнуцца неадночы. Ці то прылады сялянскай працы, ці то напаўразбураныя рэшткі старога замка або загадкавыя абрысы чыгуначнага вакзала ў карціне “Начны горад”... Адухоўленыя эмацыйным станам, дзе ўдала спалучаюцца рамяство і мастацтва, яны раскрываюць перад гледачом жывую, трапяткую, улюбёную ў Беларусь душу мастака.

На мяжы рэальнага і падсвядома-ірэальнага напісаны карціны “Парк Юрскага перыяду”, “Танец перфокусаў”, “Іншы свет”. Для моладзі больш прыцягальнымі падаліся работы “Начны горад”, “Апошні прамень”, “Геаметрыя часу”. Назве экспазіцыі адпавядалі работы “Легенда Мірскага замка”, “Нясвіж”, “Дабраўляны”. Цяпер жа творцу хвалюе новая тэма — біблейскія сюжэты. І ўжо ёсць першыя работы ў гэтым рэчышчы.

**Ларыса СЫСУН,**
**вядучы метадыст**
**па інфармацыйнай і літаратурнай**
**рабоце Палаца культуры Маладзечна**